# Віктарына «Беларускія народныя казкі»



**Беларускія казкі** - творы вуснай творчасці беларускага народу, папулярны фальклёрны жанр, перадаваны з пакалення ў пакаленне.



- **Народныя казкі маюць павучальны характар, звычайна маюць пэўную мараль: любоў да роднай зямлі, сям'і, праслаўленне мудрасці, мужнасці, кемлівасці, асуджэнне здрайцаў, гультаёў.**



- Ёсць гумарыстычныя і сатырычныя творы, якія не нясуць выразнага пэдагагічнага характару.



- **У народных казках могуць знайсці адлюстраванне пэўныя гістарычныя падзеі.**





**Мы прапануем вам**
**урыўкі з беларускіх**
**народных казак,**
**а вы паспрабуйце**
**адгадаць назву казкі.**

# З ЯКОЙ БЕЛАРУСКАЙ КАЗКІ ГЭТЫ ЎРЫВАК ?

- 1. Думала Ліса на цэлы дзень наесціся, але нават і пакаштаваць ежы не прыйшлося.





# З якой беларускай казкі гэты ўрывак?

- 2. Касіў на лузе касец. Змарыўся і сеў пад кустом адпачыць.





# З якой беларускай казкі гэты ўрывак?

- 3. Прынесла курачка сена карове. Карова з’ела сена і дала масла.





# З якой беларускай казкі гэты ўрывак?

- 4. Вось пайшоў раз кот у лес на паляванне і заблудзіўся. Шукаў-шукаў дарогу да дому — не знайшоў.





- Сеў пад ялінкай і плача.

# З ЯКОЙ БЕЛАРУСКАЙ КАЗКІ ГЭТЫ ЎРЫВАК

- 5. Дзед палажыў рог у кішэнь і кажа:

— Заўтра прыйду праверу: калі не ўцячэш адсюль, зноў выпушчу на цябе сваіх памочнікаў.

І пайшоў дзед вясёлы да хаты — з торбачкай і з рогам.

А пан назаўтра яшчэ досвіткам пакінуў маёнтак: баяўся, каб дзед са сваімі малайцамі не вярнуўся.





Сядзіць Зайка пад бярозай ды плача. Ідзе Воўк, пытае:

— Чаго ты, Зайка, плачаш?

— Як жа мне не плакаць? Жылі мы з Ліскаю блізка. Стала холадна, збудавалі мы сабе хаткі. Я сабе — з сыпучага пяску, а Ліска — са скрыпучага сняжку. Прыйшла вясна, яе хатка растала, а мая стаіць, як



# З якой беларускай казкі гэты ўрывак ?

- 7. Паверыў пеўнік лісіцы і адчыніў дзверы. А тая — ухапіла яго і панесла. Пеўнік зноў пачаў клікаць коціка:

— Коце, браце!
Мяне ліска нясе
У высокія горы,
У глыбокія норы,
Па барах, па карчах,
Аж бярэ мяне страх!..

Добра, што коцік далёка не адышоўся ад дому: пачуў ён пеўніка, прыбег і адабраў яго ад лісіцы.



# З якой беларускай казкі гэты ўрывак ?

- 8. Недакучыла пеўню цягацца з чалавекам, — пара б ужо і на седала збірацца! Залопаў ён крыламі ды як закрычыць на ўвесь кірмаш:



— Ку-ка-рэ-ку!

Пачуўшы гэта, чалавек зусім збіўся з панталыку: заяц, а пеўнем спявае!

Выкінуў ён пеўня з-за пазухі, плюнуў ды пайшоў дахаты.

Праўду кажуць старыя людзі: не той дурань, каго завуць дурнем, а той дурань, хто чужым розумам жыве.



# З якой беларускай казкі гэты ўрывак ?

- 9. **Нанесла курачка яечак поўны падпечак. Сабрала бабка яечкі ў чарапіну ды паставіла на паліцу. Мышка бегла, хвосцікам махнула, чарапіца ўпала, яечкі пабіліся.**





# З ЯКОЙ БЕЛАРУСКАЙ КАЗКІ ГЭТЫ ЎРЫВАК ?

- 10. — Не плач, дзяўчынка, — кажа бычок. — Лепш паслухай, што я табе параю. Як заржуць мяне, вазьмі маю печань і там знойдзеш залатое зярнятка. Пасадзі тое зярнятка ў садку каля хаты. Вось і ўсё.



Галя так і зрабіла, як сказаў бычок.

Вырасла з зярнятка яблынька з залатымі яблыкамі.

Хто ні ідзе, ці ні едзе каля садка — усе дзівяцца з залатой яблынькі.



# Дзякуй за ўвагу!

